Маўленчы “пашпарт”

Экзаменацыйная работа (тэст) па беларускай мове, прапанаваная на цэнтралізаваным тэсціраванні ў 2019 годзе, адпавядала Праграме ўступных іспытаў па вучэбным прадмеце “Беларуская мова” для асоб, якія маюць агульную сярэднюю адукацыю, для атрымання вышэйшай адукацыі I ступені ці сярэдняй спецыяльнай адукацыі, 2019 год, зацверджанай загадам Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 30.10.2018 № 765, і Спецыфікацыі тэста па вучэбным прадмеце “Беларуская мова” для правядзення цэнтралізаванага тэсціравання ў 2019 годзе, зацверджанай Міністрам адукацыі Рэспублікі Беларусь 03.12.2018 г.

Для ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні па беларускай мове ў 2019 годзе зарэгістраваліся 22 009 чалавек. Здавалі экзамен з улікам двух рэзервовых дзён 21 073 чалавекі.

Больш за палову паступаючых (59,15 %) закончылі ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі ў 2019 годзе. З іх 47,07 % — сярэднюю школу, 8,39 % — гімназію, 3,67 % — ліцэй. Крыху больш за 9 % абітурыентаў з’яўляліся выпускнікамі ўстаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі і 2,67 % — устаноў прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Значную долю абітурыентаў склалі выпускнікі мінулых гадоў — 28,03 %.

Згодна са статыстычнымі назіраннямі ў апошнія гады беларускую мову ў якасці ўступнага іспыту выбіраюць пераважна выпускнікі ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, размешчаных у раённых цэнтрах (сёлета — 34,71 %) і ў сельскай мясцовасці (сёлета — 31,67 %). Колькасць удзельнікаў тэсціравання, якія закончылі сталічныя ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі, — 14,03 % (ЦТ-2018 — 13,21 %; ЦТ-2017 — 11,76 %).

Максімальна магчымы бал (100) атрымалі 43 абітурыенты. З іх 34 з’яўляюцца выпускнікамі бягучага года ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, размешчаных у розных населеных пунктах. Стабальныя вынікі размеркаваны па ўсіх 10-і варыянтах тэста.

Не пераадолелі парогавага значэння тэставага бала (10), устаноўленага Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, 0,98 % абітурыентаў ад агульнай колькасці ўдзельнікаў тэсціравання (ЦТ-2018 — 5,61 %; ЦТ-2017 — 7,52 %).

З ліку выпускнікоў бягучага года не набралі мінімальнага бала, неабходнага для ўдзелу ў конкурсе ва ўстановы вышэйшай адукацыі, 52 выпускнікі сярэдняй школы (ЦТ-2018 — 315 чалавек; ЦТ-2017 — 395 чалавек), 4 — гімназіі (ЦТ-2018 — 6 чалавек; ЦТ-2017 — 6 чалавек), 16 — УССА (ЦТ-2018 — 157 чалавек; ЦТ-2017 — 272 чалавекі), 13 — УПТА (ЦТ-2018 — 100 чалавек; ЦТ-2017 — 183 чалавекі).

Сёлета ўпершыню, як мінімум, за тры гады не было ліцэістаў, якія б атрымалі тэставы бал, ніжэйшы за 10. Асноўную частку тых абітурыентаў, хто атрымаў менш за 10 балаў, па-ранейшаму складаюць выпускнікі мінулых гадоў — 120 чалавек (ЦТ-2018 — 737 чалавек; ЦТ-2017 — 1163 чалавекі). Пяць абітурыентаў бягучага года, ці 0,02 %, не справіліся з ніводным заданнем.

Прапануем аналіз вынікаў цэнтралізаванага тэсціравання па раздзелах мовы.

Фанетыка і арфаэпія. Культура маўлення.

Адукаваную асобу, вядома, характарызуе не толькі пісьмовае маўленне. Часам чалавек правільна піша словы тыпу *разетка* або *сантыметр*, а пры вымаўленні дапускае грубыя (супраць простых правіл) памылкі: *р*[*ы*]*зетка* і *сан*[*ц*]*ыметр*. Між тым уменне гаварыць забяспечвае кантакт з любым субяседнікам, любой аўдыторыяй, а таксама ўзаемаразуменне і рэалізацыю мэты. Больш таго, сёння ва ўмовах хуткага развіцця публічных выступленняў роля культуры маўлення відавочна ўзрастае, а значыць, узрастае і грамадская роля фанетыкі і арфаэпіі як тэарэтычных і практычных дысцыплін.

У матэрыялы ЦТ кожны год уключаецца заданне на праверку ведання фанетыка-арфаэпічных законаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы. У бягучым годзе шматлікія абітурыенты, як паказалі іх адказы, не засвоілі, што зычныя гукі [в], [в’], [л], [л’], [м], [м’], [н], [н’], [р], [й], [ў] не проста звонкія, а санорныя, якія не маюць парных глухіх. Разгледзім канкрэтны прыклад.

Узор задання:

В1. У ***9-м*** сказе тэксту вызначце слова, у якім усе зычныя гукі глухія. Запішыце гэта слова так, як яно пададзена ў ***9-м*** сказе.

(9) *Гэтыя лёгка разгадваюцца, але сустракаюцца прозвішчы, якія не маюць падказкі, над якімі трэба паламаць галаву.*

Адказ: падказкі.

Значная частка абітурыентаў, якія выконвалі 1-ы варыянт тэста, убачыла ў слове *падказкі* асіміляцыю зычных па глухасці [*паткаск’і*] і правільна адзначыла, што ў ім усе зычныя гукі глухія. Другім па папулярнасці (яго ўзялі за правільны адказ 352 чалавекі) было слова *лёгка*. Значыць, амаль 17 % з тых паступаючых, хто працаваў з 1-м варыянтам, ведалі пра такую з’яву, як асіміляцыя па глухасці [*л’охка*], аднак не засвоілі санорных і аднеслі зычны гук [л’] да глухіх.

Арфаграфія. Культура маўлення.

Любая моўная сітуацыя для навучэнцаў на занятках ва ўстановах адукацыі непраблемная, таму што пры неабходнасці настаўнік нагадае правіла і дапаможа знайсці правільнае рашэнне. Калі ж навучэнцы трапляюць ва ўмовы самастойнага пісьма (на экзамене), то вынік поўнасцю залежыць ад наяўнасці ведаў “пад рукой”, ад ступені валодання сілай аналізу і сінтэзу.

Найбольш складаным для абітурыентаў з раздзела стала заданне А2 на праверку ведання тэмы “Правапіс галосных ***о***, ***э***, ***а***”. Колькасць выпускнікоў усіх устаноў адукацыі, хто дапусціў у дадзеным заданні памылкі на этапе кваліфікацыі арфаграмы і прымянення правіла, вагаецца ад 11 (не засвоілі, што ў словах славянскага паходжання не пад націскам на месцы літары ***о*** пішацца літара ***а***: *мар**а**зы́*, *вал**а**сы́*) да 38 % (няправільна напісалі літару ***э*** ў словах іншамоўнага паходжання, у якіх у адпаведнасці з беларускім літаратурным вымаўленнем пішацца літара ***а***: *д**а**лікатэс*, *характ**а**рыстыка*).

Тэма “Правапіс ***у–ў***” падаецца на пачатковай ступені вывучэння прадмета і з’яўляецца запатрабаванай як на працягу ўсяго курса навучання ва УАСА, так і ва УССА, УПТА. Яе практычная важнасць несумненная, бо без арфаграм ***у–ў*** не існуе ніводнага тэксту, нават мікратэксту. У вучэбных дапаможніках дастаткова поўна і сістэмна пададзены тэарэтычны матэрыял, да яго прапанаваны актуальныя практыкаванні. Нягледзячы на ўсё гэта, сярэдні працэнт выканання задання А4 выпускнікамі школ не перавысіў 50. Апрача таго, няправільны адказ на заданне дала абсалютная большасць выпускнікоў мінулых гадоў і навучэнцаў устаноў сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Колькасць тых абітурыентаў, у каго недастаткова былі сфарміраваны канкрэтныя арфаграфічныя ўменні, вагаецца ад 15 (не ведалі, што гук [ў] зычны і, адпаведна, пасля літары ***ў*** (*нескладовае*) пішацца *у* (*складовае*): *быў* ***узрушаны***) да 32 % (не засвоілі напісання ***ў*** (*нескладовага*) у словах іншамоўнага паходжання на *-ум*, *-ус*: *лінолеум*, *радыус*).

Звярнуўшыся да вынікаў выканання заданняў па арфаграфіі А1, А3, А5–А7, адмаркіруем найбольш частотныя памылкі, пазначыўшы ў дужках колькасць паступаючых, якія іх дапусцілі: А1 — напісанне з вялікай літары назваў птушак у прыкладах тыпу *птушка* (***Ч/ч)апля*** (6 %); А3 — напісанне літары ***я*** ў прыназоўніку *без* у прыкладах тыпу *б_з нумара* (25 %); А5 — напісанне літары ***ь*** пасля губных зычных у словах-прыкладах тыпу *п_едэстал* (16 %); А6 — напісанне адной літары ў словах тыпу *рассыпаць*, дзе спалучэнне аднолькавых зычных гукаў на стыку прыстаўкі і кораня перадаецца падвоеным напісаннем адпаведнай літары (34 %); А7 — напісанне літары ***д*** у словах-прыкладах тыпу *сэр_ца*, дзе гістарычнае спалучэнне зычных гукаў [рдц] і вымаўляецца, і перадаецца на пісьме як [рц] (27 %).

Лексіка. Фразеалогія. Культура маўлення.

Словы з’яўляюцца сведкамі ўсіх змен у жыцці грамадства, адлюстроўваючы своеасаблівасць інтарэсаў, звычаяў, думак людзей. Гэта прымушае вельмі ўважліва ставіцца да кожнага слова, а не супакойваць сябе вывадам: яго рэдка дзе пачуеш, яго лексічнае значэнне мне невядомае. Здараецца, такі вывад робіцца нягледзячы на тое, што і замены такому слову няма. Напрыклад, летнюю паркавую або садовую пабудову для адпачынку ў беларускай мове называюць адным словам — *альтанка*. Ва ўсякім выпадку, малавядомым слова з’яўляецца толькі да таго часу, пакуль не даследуеш яго лексічнага значэння, гісторыі, этымалогіі і інш. Дарэчы, быць даследчыкам для свайго развіцця — гэта вельмі цікава і прэстыжна.

Чаго не ведалі і чаго не ўлічылі некаторыя абітурыенты-2019, вызначаючы ў тэксце пэўную лексічную адзінку, патлумачым на аснове канкрэтнага тэставага задання.

Узор задання:

В6. У адным са сказаў ***11–14*** знайдзіце слова, якое ў дадзеным тэксце мае значэнне *‘выклікаць душэўны ўздым, заахвочваць да якіх-небудзь дзеянняў’*. Запішыце гэта слова ў той граматычнай форме, у якой яно пададзена ў адным са сказаў ***11–14***.

(11) *Я штодзень была аблашчана святлом і цеплынёй твайго жыццелюбівага сэрца.* (12) *Ты заўжды разумеў, паважаў і падтрымліваў, знаходзіў патрэбныя словы, дапамагаў.* (13) *І ніколі не казаў, што ў мяне нешта можа не атрымацца.* (14) *Твая падтрымка акрыляла, твая дапамога ратавала.*

Адказ: акрыляла.

З 2106 абітурыентаў, якія выконвалі 6-ы варыянт тэста, 1071 чалавек далі правільны адказ. Другім па папулярнасці і, адпаведна, няправільным адказам было слова *падтрымка*. Яго адзначылі 320 паступаючых, якія 1) не ведалі лексічнага значэння двух слоў — *акрыляла* і *падтрымка*; 2) праігнаравалі акрэсленую ў значэнні слова яго часцінамоўную прыналежнасць і выбралі для адказу не дзеяслоў, а назоўнік.

Галоўны характар нашай мовы — лёгкасць, з якой выказваецца думка і якая набыта ў многім дзякуючы наяўнасці і развіццю багатых моўна-выяўленчых сродкаў. Умелае карыстанне ўніверсальнымі сродкамі, што надаюць маўленню экспрэсію, вобразнасць, эмацыянальную выразнасць, паказвае ўзровень маўленчай культуры асобы, яе маўленчы густ. Такім чынам, мы падкрэсліваем важную ролю заданняў па фразеалогіі ў тэсце.

Чым абумоўлены няправільныя адказы паступаючых на заданне па фразеалогіі В8, вызначым на прыкладзе з 3-га варыянта тэста.

Узор задання:

В8. Да слоў-кампанентаў, прапанаваных у левым слупку табліцы, падбярыце словы-кампаненты з правага слупка, каб узнавіць фразеалагізмы. Устанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

А. ... свайго слова.	**1.** Дар
Б. ... мовы.	**2.** Гульня
В. ... слоў.	**3.** Веданне
Г. ... слядоў.	**4.** Замятанне
	5. Гаспадар

Правільны адказ на прыведзенае заданне — **А5Б1В2Г4**. Аднак 40 % з тых абітурыентаў, хто выконваў 3-і варыянт тэста, далі адказ — А5Б3В2Г4. Як бачым, яны не ўзнавілі адной устойлівай моўнай адзінкі *гульня слоў*, якая мае значэнне *‘дасціпны, каламбурны выраз’*, затое ў якасці фразеалагізма падалі словазлучэнне *‘веданне мовы’*. Чаго не ўбачылі паступаючыя? Безумоўна, самага галоўнага: у словазлучэнні з прамым значэннем *‘веданне мовы’* адсутнічае вызначальная прыкмета фразеалагізма — адзіны цэласны сэнс. Сэнс дадзенага словазлучэння вынікае са значэнняў двух самастойных слоў.

Марфемная будова слова. Словаўтварэнне. Культура маўлення.

У сярэднім ад 20 да 40 % абітурыентаў няправільна разабралі па саставе аддзеяслоўныя назоўнікі з суфіксам *-нік-*, якія абазначаюць асобу ці прадмет (тып прадуктыўны), і аддзеяслоўныя прыметнікі з суфіксам *-лів-*, якія абазначаюць схільнасць да дзеяння (тып прадуктыўны). Так, напрыклад, два суфіксы ў словах *пакорлівы* і *настаўнік* памылкова адзначылі 41,94 % і 36,21 % тых абітурыентаў, хто выконваў 5-ы варыянт тэста (2110 чалавек). Прычыны ў асноўным дзве: 1) паступаючыя не падбіралі да слоў аднакаранёвых лексічных адзінак (*пакора, пакорлівасць, пакорнасць, скарыцца; настаўніца, настаўнічаць, настаўніцкі*); 2) не супастаўлялі аднолькавых па саставе слоў з мэтай вызначэння наяўнасці суфіксаў *-лів-* і *-нік-* у беларускай мове (*маўклівы, ганарлівы, настойлівы; заступнік, напарнік, алешнік*). У гэтым жа варыянце няправільна пазначылі толькі адзін суфікс у словах *калектыўнасць* і *друкарскі* больш за 20 % і за 40 % абітурыентаў адпаведна. Вывад аналагічны: марфемны аналіз лексічных адзінак не праводзіўся, суфіксы вызначаліся зрокава. У адваротным выпадку, звязаўшы кожнае з гэтых слоў у аднакаранёвы ланцужок, паступаючыя заўважылі б у іх саставе па два суфіксы: *калектыў – калектыўны – калектыўнасць* → суфіксы *-н-* і *-асць*; *друк – друкар – друкарскі* → суфіксы *-ар-* і *-ск-*.

Для словаўтваральнага аналізу сёлета былі прапанаваны чатыры мадэлі: аддзеяслоўныя назоўнікі жаночага роду, утвораныя бяссуфіксным спосабам; складанаскарочаныя словы (абрэвіятуры); прыметнікі, утвораныя ад складаных назоўнікаў пры дапамозе суфікса *-н-*; прэфіксальна-суфіксальныя дзеясловы, утвораныя ад назоўнікаў. Цяжкасці ў паступаючых выклікала мадэль словаўтварэння аддзеяслоўных назоўнікаў жаночага роду, утвораных бяссуфіксным спосабам, тыпу *адмова, заўвага, заслуга*.

Патлумачым механізм дапушчэння памылак на аснове прыкладу з 4-га варыянта тэста.

Узор задання:

В10. Вызначце спосаб утварэння прыведзеных слоў і ўстанавіце адпаведнасць паміж слупкамі табліцы. Адказ запішыце ў выглядзе спалучэння літар і лічбаў, захоўваючы алфавітную паслядоўнасць літар левага слупка. Памятайце, што некаторыя даныя правага слупка могуць не выкарыстоўвацца ўвогуле. Напрыклад: А2Б5В3Г4.

А. Заўвага.	**1.** Прыставачны.
Б. Вадародны.	**2.** Суфіксальны.
В. Дзетсад.	**3.** Абрэвіяцыя.
Г. Заахвоціць.	**4.** Прыставачна-суфіксальны.
	5. Бяссуфіксны.

Адказ: А5Б2В3Г4.

Каля 30 % з тых абітурыентаў, хто пісаў 4-ы варыянт (2109 чалавек), памылкова адзначылі, што слова *заўвага* ўтворана прыставачным спосабам, правёўшы марфемны аналіз: разабралі слова па саставе (па марфемах) і выдзелілі прыстаўку *за-*. Пры словаўтваральным аналізе, улічыўшы лексічнае значэнне слова *заўвага*, падрыхтаваныя абітурыенты 1) суаднеслі яго з дзеясловам *заўважыць*, а не з назоўнікам *увага*; 2) вызначылі ў дзеяслове ўтваральную аснову *заўваж-*; 3) вызначылі словаўтваральны сродак — нулявы суфікс; 4) правільна ўстанавілі спосаб утварэння — бяссуфіксны: *заўваг-Ø-а ← заўваж/ы/-(ць)*.

Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення.

У заданні А9 на праверку ведання правапісу складаных назоўнікаў найбольш пытанняў у абітурыентаў выклікалі назоўнікі, якія пішуцца разам з першымі іншамоўнымі часткамі тыпу *гідра-, аэра-* (*гідрасістэма, аэраклуб*), і назоўнікі, што пішуцца праз злучок з пачатковай запазычанай часткай міні- (*міні-касілка*).

Захаванню мовы, вядома, садзейнічаюць літаратурныя нормы. Не сакрэт, што даволі часта парушэнне літаратурных нормаў сучаснай беларускай мовы звязана з недакладным ужываннем лічэбнікаў. У сувязі з гэтым тэставае заданне А10, у якім у мінулыя гады падаваўся матэрыял на праверку правапісу і скланення лічэбнікаў, было змястоўна абноўлена і скіравана на вызначэнне ўменняў паступаючых спалучаць у вусным і пісьмовым маўленні лічэбнікі з назоўнікамі. Аналіз паказаў, што больш за 80 % удзельнікаў тэсціравання ведалі правілы спалучэння зборных лічэбнікаў з назоўнікамі, якія абазначаюць асоб

абітурыентаў-2019

мужчынскага полу і маладых істот (*двое інжынераў, чацвёра архітэктараў; трое качанят*), з назоўнікамі, якія маюць форму толькі множнага ліку (*двое акуляраў, двое сутак*).

Напісанне праз злучок ці асобна прыметнікаў з першымі іншамоўнымі часткамі тыпу *архі-, ультра-* (*архіскладаны, ультрагукавы*) і складаных прыметнікаў тыпу *густалісты, кругласутачны,* утвораных ад словазлучэнняў, — гэта самая распаўсюджаная памылка, дапушчаная паступаючымі ў заданні А11. Няправільна з іх адказалі больш за 20 %.

Тыповыя памылкі падчас выканання задання А12 на праверку ведання правапісу асабовых канчаткаў дзеясловаў абумоўлены адсутнасцю ў іспытуемых умення вызначаць спражэнне дзеясловаў і навыку суаднясення дзеясловаў I, II спражэнняў з трываннем, са слабым засваеннем канчаткаў дзеясловаў I, II спражэнняў.

Невысокі працэнт паспяховасці выканання задання А13 тлумачыцца недакладным марфалагічным веданнем правапісу прыслоўяў, спосабаў іх утварэння і недастаткова сфарміраваным марфалагічным уменнем адрозніваць прыслоўі ад іншых часцін мовы. Працэнт памылак, дапушчаных у заданні, вагаецца ад 18 (абітурыенты не ведалі, што прыслоўе, якое мае прыстаўку *па-* і заканчваецца на *-аму, -яму,* пішацца праз злучок — *выглядаць па-ранейшаму*) да 41 (абітурыенты не засвоілі правіл напісання разам прыслоўяў, утвораных ад колькасных лічэбнікаў прыставачна-суфіксальным спосабам, — *палоць удзвюх*).

Заданне А14 правярала ўменне адрозніваць часціцу *не* і прыстаўку *не-*, веданне правіл напісання іх асобна/разам з рознымі часцінамі мовы. Як сведчаць вынікі тэсціравання, 38 % абітурыентаў няправільна напісалі разам часціцу *не* з дзеепрыслоўямі (*не заўважыўшы змен*); 48 % — з поўнымі дзеепрыметнікамі, пры якіх ёсць залежнае слова (*не прадугледжаныя намі абставіны*); 38 % — з кароткімі дзеепрыметнікамі (*доследы не праведзены*). Каля 20 % дапусцілі памылкі, аддзяліўшы прыстаўку *не-* ад прыслоўяў, якія без яе не ўжываюцца (*нечакана прыехаць*). Больш за 40 % паступаючых не распазналі адсутнасці супрацьпастаўлення з'яў у прыкладах з супраціўным злучнікам *але* і няправільна напісалі словы з часціцай *не* асобна (*нешырокая, але глыбокая рака*).

Статыстычныя ўласцівасці задання А15 на праверку валодання нормамі ўжывання часціц *не* і *ні* ўказваюць на аднатыпны характар памылак, якія кожны год дапускаюцца большасцю абітурыентаў:

— няправільнае ўжыванне часціцы *не* ў складаных сказах, дзе ў даданай частцы для ўзмацнення сцвярджэння ўжываецца часціца *ні* (*Бывае, што хтосьці пакідае свой дом і дзесьці навек асядае, а я, дзе б ні быў, у старое гняздо, як бусел, заўжды прылятаю.*);

— няправільнае ўжыванне часціц *ні* замест *не* пры кожнай частцы састаўнога дзеяслоўнага выказніка для надання сказу сцвярджальнага сэнсу (*Знакамітыя слуцкія паясы не маглі не стаць гістарычным культурным сімвалам Беларусі.*).

Асноўныя прычыны памылак, дапушчаных некаторымі абітурыентамі ў заданнях В2–В4, абагульнены ў табліцы.

Умова задання	Адказ	Папулярныя няправільныя адказы	Каментарый
В2. Запішыце падкрэслены ў ***6-м*** сказе тэксту назоўнік у форме назоўнага склону множнага ліку. (6) *Сёння возера Свіцязь з навакольным* ***лесам*** *аб'яўлена помнікам прыроды: тут расце мноства рэдкіх парод раслін і дрэў, якія занесены ў Чырвоную кнігу.*	лясы	лясамі	памылковы адказ абітурыенты маглі даць па дзвюх прычынах: не засвоілі склонаў у беларускай мове; не засвоілі тэмы «Правапіс склонавых канчаткаў назоўнікаў у форме множнага ліку»
		леса	абітурыенты дапусцілі памылку пад уплывам правапісу рускай мовы. Параўнайце ў рускай мове: *леса*
В3. Запішыце падкрэслены ў ***18-м*** сказе тэксту прыметнік у форме назоўнага склону адзіночнага ліку мужчынскага роду. (17) *Я часта імкнулася зазірнуць табе ў вочы, бо ведала: яны свецяцца дабрынёй, яны выпраменьваюць любоў.* (18) *Сапраўдную, гаючую, бацькоўскую,* ***святую.***	святы	святой	абітурыенты дапусцілі памылку пад уплывам правапісу рускай мовы. Параўнайце ў рускай мове: *святой*
		святога	памылковы адказ абітурыенты маглі даць па дзвюх прычынах: не засвоілі склонаў у беларускай мове; не засвоілі тэмы «Скланенне прыметнікаў»
В4. Запішыце падкрэслены ў ***1-м*** сказе тэксту займеннік у форме назоўнага склону множнага ліку. (1) *У каго б мы ні спыталіся,* ***чый*** *тата самы лепшы, кожны адкажа: «Мой!»*	чые	чыі чы	абітурыенты дапусцілі памылку пад уплывам правапісу рускай мовы. Параўнайце ў рускай мове: *чьи*
		чыіх	памылковы адказ абітурыенты маглі даць па дзвюх прычынах: не засвоілі склонаў у беларускай мове; не засвоілі тэмы «Скланенне займеннікаў»

Тэма "Дзеепрыслоўі незакончанага і закончанага трываньня, іх утварэнне і правапіс" не выклікала цяжкасцей у больш за 50 % выпускнікоў гімназій і ліцэяў. Як і ў мінулыя гады, не пераадолелі 50 %-ны рубеж выпускнікі школ. Узровень складанасці задання В5 для выпускнікоў устаноў сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі і выпускнікоў мінулых гадоў значна перавысіў медыянны. Аналіз адказаў тых абітурыентаў, хто памыліўся, паказаў, што многія зусім не валодалі паняццем *дзеепрыслоўе*. Імі былі праігнараваны практычна ўсе характарыстыкі гэтай асобай дзеяслоўнай формы.

Карэктнае тлумачэнне лакунаў, якія не дазволілі выпускнікам усіх устаноў адукацыі паспяхова справіцца з заданнем В9, патрабуе пааспектнага аналізу дапушчаных імі памылак. Па-першае, пераважнай большасцю тых паступаючых, хто даў памылковы адказ, няправільна класіфікаваліся як злучнікі прыслоўе *дзе (Там і пчолы, там і мёд,* ***дзе*** *летам кветак карагод.)* і займеннік *што (Сасновы пах,* ***што*** *разносяць бары, лечыць лепш, чым лечаць дактары.)* — злучальныя словы ў даданых частках складаназалежных сказаў. Аднак фарміраванне ўмення адрозніваць указаныя займеннік і прыслоўе ад злучнікаў адбываецца неаднойчы ў працэсе навучання: у 6-м класе падчас вывучэння тэмы "Займеннік як самастойная часціна мовы", у 7-м — "Прыслоўе як самастойная часціна мовы", у 9-м — "Складаназалежныя сказы". І гэта без уліку гадзін, адведзеных на паўтарэнне дадзеных тэм у 10-м і 11-м класах. Значыць, прабелы, адсутнасць адпаведных тэарэтычных навыкаў і практычных уменняў у абітурыентаў неапраўданыя. Па-другое, значная частка іспытуемых не змагла ідэнтыфікаваць супраціўны злучнік *затое*, пры дапамозе якога звязваюцца часткі складаназлучанага сказа з супраціўнымі сэнсавымі адносінамі *(Невялічкае стварэнне мурашка,* ***затое*** *ёсць чаму ў яе нам павучыцца.).* Адны з іспытуемых класіфікавалі яго як прыслоўе, іншыя — як прыназоўнік. Разам з тым названы злучнік вывучаецца ў 7-м класе ў тэме "Злучальныя злучнікі", у 9-м — "Складаназлучаныя сказы" і разглядаецца падчас паўтарэння дадзеных тэм у 10-м і 11-м класах. Такім чынам, прычыны памылак не ў лакунах, якія маглі быць абумоўлены нязначнай колькасцю вучэбнага матэрыялу. Абітурыенты самі адмовілі сабе ў веданні тэмы. Абсалютная большасць паступаючых правільна класіфікавала часціцу *ці (****Ці*** *ж нехта стане аспрэчваць тое, што царом у вялікім грыбным сямействе з'яўляецца баравік?).* У гэтым выпадку можна смела казаць пра наяўнасць нітачак, якія звязалі тое, што ведалі абітурыенты, з тым, што прынесла поспех.

Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення.

У заданне А16 кожны год уключаюцца сінтаксічныя канструкцыі, што беражліва захоўваюць асаблівасці беларускай мовы. Яны ўяўляюць сабой найцікавейшы моўны матэрыял, веданне якога (гэта важна падкрэсліць) на кожным ЦТ дэманструе ўсё большая колькасць абітурыентаў.

Назавём колькасць і характар памылак, дапушчаных абітурыентамі-2019, у параўнанні з вынікамі паступаючых у мінулым годзе: 28 % адзначылі характэрныя для беларускай мовы словазлучэнні з прыназоўнікам *пра* тыпу *цікавіцца пра здароўе* як няправільныя (ЦТ-2018 — памылкі дапусцілі 35 % паступаючых); 32 % не засвоілі таго, што дзеясловы са значэннем ветлівасці ўтвараюць словазлучэнні з назоўнікамі і займеннікамі ў форме давальнага склону *(прабачыць пляменніку)*, дзеясловы тыпу *жартаваць, дзівіцца* — з назоўнікамі і займеннікамі ў форме роднага склону *(дзівіцца з дачушкі)*; не ведалі характэрных для беларускай мовы словазлучэнняў накшталт *дом на тры паверхі, віншаваць з нагоды свята, загадчык кафедры* (ЦТ-2018 — памылкі дапусцілі 40 % паступаючых); 17 % не засвоілі таго, што пры прыметніку ў форме вышэйшай ступені параўнання назоўнік і займеннік ужываюцца ў форме вінавальнага склону з прыназоўнікам *за — вышэйшы за сябра, смачнейшы за цукеркі* (падчас ЦТ-2015, калі была прапанавана падобная опцыя, памылкі дапусцілі 30 % іспытуемых).

Няўменне або нежаданне ўявіць кожны сказ схематычна, убачыць яго дакладную сінтаксічную будову — галоўныя прычыны няправільнага выканання шматлікімі паступаючымі задання А17 на распазнаванне членаў сказа і А18 на ідэнтыфікацыю аднасастаўных і двухсастаўных сказаў. Фармальны падыход да правядзення сінтаксічнага аналізу сказа з'яўляецца асноўным недахопам, які не дазваляе пэўнай частцы абітурыентаў справіцца з моўным матэрыялам на праверку правіл пастаноўкі знакаў прыпынку ў сказах.

Выконваючы заданне А19, 20 % удзельнікаў ЦТ палічылі не толькі правільнай, але і *абавязковай* пастаноўку працяжніка паміж дзейнікам і выказнікам, выражанымі назоўнікамі ў форме назоўнага склону пры наяўнасці пабочнага слова *(Згода, вядома, сіла грамады.)*; паміж дзейнікам, выражаным назоўнікам у форме назоўнага склону і выказнікам, выражаным прыметнікам у форме вышэйшай ступені параўнання *(Добрае слова за мёд саладзейшае.).* У той жа час 56 % удзельнікаў тэсціравання не паставілі працяжніка паміж дзейнікам-назоўнікам і фразеалагізмам у ролі выказніка *(Наш калектыў — пашукаць такога!)*.

Да 40 % абітурыентаў памыліліся, паставіўшы коску ў заданні А20 паміж аднароднымі членамі сказа, звязанымі адзіночным размеркавальным злучнікам *або (Спакоем зор, гаёў або ніў я часта сам сябе лячыў.)*, і не раздзяліўшы аднародныя члены сказа, звязаныя паўторным спалучальным злучнікам *і (Закрасавалі кветкі, і кусты, і дрэвы — свет зрабіўся чароўным, трапяткім.).* Разам з тым больш за 90 % удзельнікаў тэсціравання добра ведалі правілы пастаноўкі знакаў прыпынку паміж аднароднымі членамі сказа, звязанымі супраціўным злучнікам *а (Жыццё не сцежка, а вялікая дарога, на якой заўжды развілін многа.)* і спалучальным адзіночным злучнікам *і (Верасы пад лісцем спалі, бор зялёны гнуўся, ды ляцелі ў цёмнай далі журавы і гусі.)*.

У аснове памылак, дапушчаных большасцю сёлетніх абітурыентаў (ад 35 да 40 %) пры выкананні задання А21 на праверку ведання правіл пастаноўкі знакаў прыпынку ў сказах з параўнальнымі зваротамі, ляжыць слабае засваенне наступных правіл: коскамі не выдзяляюцца звароты са значэннем *'у якасці' (Канстанціна Астрожскага мы ведаем* ***як выдатнага дзяржаўнага дзеяча****, які будаваў замкі, манастыры, цэрквы, адчыняў на свае грошы школы ды шпіталі для хворых.)* і выказнікі, нават калі пры іх ёсць параўнальны злучнік *(Грэчневае поле што пасека, дзе так салодка пахне мёдам.)*.

Сінтаксічна-пунктуацыйны кантроль у заданні А22 ахапіў сферу адасобленых членаў сказа. У асноўным памылкі былі абумоўлены парушэннем пунктуацыйных нормаў у сказах з дзеепрыслоўнымі зваротамі *(Ласкава запрашаючы на карнавал, вітае зноў нас навагодні вечар у чарадзе калядных зыркіх свечак.)* і з адзіночным дзеепрыслоўем, якое знаходзілася ў сярэдзіне сказа перад дзеясловам-выказнікам *(У час руховага світання люблю, прачнуўшыся, паслухаць драздоў вясёлае свістанне.).* Іх не выдзелілі ад 36 да 40 % іспытуемых.

Эфектыўнымі сродкамі выражэння ў маўленні камунікатыўных адносін з'яўляюцца пабочныя канструкцыі. Ступень валодання абітурыентамі катэгорыяй пабочнасці традыцыйна стала аб'ектам кантролю ў заданні А23. Як і ў мінулым годзе, каля 60 % паступаючых не справіліся з заданнем. Многія з іх расстаўлялі знакі прыпынку, кіруючыся толькі інтанацыяй пры поўнай адсутнасці семантыка-граматычнага аналізу. Увогуле ў цэнтры ўвагі знаходзяцца дзве моўныя адзінкі, якія цесна звязаны з жыццём, з практычным кантэкстам: у вусным і пісьмовым маўленні мы часта ўжываем словы *амаль (Падаў кроплямі малымі цёплы дожджык шапатлівы, ён шаптаў нешта ў лясочку амаль кожнаму лісточку.)* і *нават (Для нас мілейшай прыроды за беларускую няма: яна ўсіх нас надзяліла душой нават такою, як сама.).* На пісьме дадзеныя словы знакамі прыпынку не выдзяляюцца, аднак большасць памылак абітурыентаў (30 %) якраз і звязана з выдзяленнем гэтых лексічных адзінак коскамі.

Па-ранейшаму ніякіх цяжкасцей у 90 % паступаючых не выклікалі складаназлучаныя сказы (заданне А24), дзе часткі з супраціўным значэннем звязаны пры дапамозе супраціўнага злучніка *а (Продкі нам Зямлю ў спадчыну перадалі, а нашчадкі нам яе пазычылі.).* Колькасна-змястоўны аналіз усіх адказаў абітурыентаў паказаў наступнае: 80 % (ЦТ-2018 — 60 %) засвоілі, што ў складаназлучаных сказах ставіцца працяжнік перад спалучальным злучнікам *і*, калі ў другой частцы сказа падкрэсліваецца вынік у адносінах да першай *(Крыкнеш вясною ў лесе — і рэха маладое крык падхопіць-панясе.)*; 70 % (ЦТ-2018 — 70 %) ведалі, што знакі прыпынку не ставяцца паміж часткамі складаназлучаных сказаў, якія маюць спалучальныя сэнсавыя адносіны, звязаны адзіночным спалучальным злучнікам *і*, а ў першай частцы ёсць агульны для іх член сказа *(У небе месяц прытаіўся румяны і Млечнага Шляху разаслаўся ручнік саматканы.)*; 50 % (ЦТ-2018 — 60 %) ведалі, што паміж часткамі складаназлучанага сказа са спалучальнымі сэнсавымі адносінамі перад спалучальным злучнікам *і* ставіцца коска *(Ляжыць зямля пад коўдрай белай, і дрэвы ў папахах сярэбраных вартуюць ранішнюю цішыню.)*; 75 % (падчас ЦТ-2018 такой опцыі не было) завучылі, што паміж часткамі складаназлучанага сказа з размеркавальнымі сэнсавымі адносінамі, звязанымі размеркавальным злучнікам *то — то*, ставіцца коска *(Сінічка ў парку то звонка цінькала, то, старанна хутаючы сваю песеньку ад марозу, яна на нейкі час заціхала.)*.

Матэрыялам тэставага задання А25 правяралася ступень валодання пунктуацыйнымі нормамі, якія вызначаны для складаназалежных сказаў. Сёлета ад 19 да 24 % абітурыентаў дапусцілі памылкі пры пастаноўцы знакаў прыпынку ў складаназалежных сказах, дзе даданая частка стаіць пасля і ў сярэдзіне галоўнай *(Сёння ў многіх краінах Еўропы і Азіі поўнасцю знікла тая самая чаротаўка, большая частка сусветнай папуляцыі якой сканцэнтравана ў Беларусі. Брусніцы і журавіны, якія маюць бензойную кіслату, могуць доўга захоўвацца без цукру.)*; у складаназалежных сказах з сузалежным і паслядоўным падпарадкаваннем частак *(Беларускае слова «падручнік» удала характарызуе асаблівасць кніг, па якіх вучацца ў школе, бо яны заўсёды ў вучня пад рукой. Ніводная мова ізалявана не жыве, бо не жыве ізалявана народ, які на ёй размаўляе.)*; у складаназалежных сказах з падпарадкавальнымі злучнікамі *што* і *калі*, якія стаяць побач, і пры гэтым ёсць другая частка *то* парнага злучніка *калі — то (Людзі заўважылі, што калі бяроза раней за вольху распусціцца, то лета будзе сухое і сонечнае.)*. Паміж аднароднымі даданымі часткамі, звязанымі спалучальным злучнікам *і*, няправільна паставілі коску 44 % удзельнікаў тэсціравання *(Мы жывём у такой краіне, дзе хвоі дастаюць да аблачынак і дзе рэкі, азёры заўсёды ў суседстве з лясамі, напоўненымі птушынымі галасамі.)*.

► ► ► 12 стар.

Маўленчы “пашпарт” абітурыентаў-2019

◄◄◄ 11 стар.

Выконваючы заданне А26 на пастаноўку знакаў прыпынку ў бяззлучнікавым складаным сказе, некаторыя абітурыенты не зрабілі шэраг наступных неабходных дзеянняў. Па-першае, важна было ўявіць кожны сказ схематычна. Такое дзеянне-прыём дапамагло б убачыць дакладную сінтаксічную пабудову сказаў. Па-другое, неабходна было ўстанавіць сэнсавыя адносіны паміж іх часткамі. І толькі пасля гэтага, абапіраючыся на веданне ўмоў пастаноўкі знакаў прыпынку, расставіць іх у сказах.

Заданне А27 традыцыйна правярала веданне правіл пастаноўкі знакаў прыпынку ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі частак. Прывядзём прыклад з 8-га варыянта тэста (варыянт выконвалі 2089 чалавек) і колькасць адказаў паступаючых у працэнтных адносінах насупраць кожнай опцыі.

Узор задання:

А27. Адзначце правільныя сцверджанні ў дачыненні да пунктуацыі сказа:

Павучок спусціўся на павуцінцы з лазовага куста$_1$ што нахіліўся над самай вадой$_2$ зазірнуў у вадзяное люстра і хуценька пачаў падымацца$_3$ яго, відаць, спалохала глыбіня$_4$ а яшчэ, можа, ён не быў тым вадзяным павучком$_5$ якія ўмеюць плаваць.

1) на месцы лічбы **1** трэба паставіць працяжнік (14 %);
2) на месцы лічбы **2** трэба паставіць коску (90 %);
3) на месцы лічбы **3** трэба паставіць двукроп’е (64 %);
4) на месцы лічбы **4** не трэба ставіць знак прыпынку (16 %);
5) на месцы лічбы **5** трэба паставіць коску (76 %).

Адказ: 2,3,5.

Правёўшы структурна-семантычны і пунктуацыйны разбор складанай сінтаксічнай канструкцыі (складанага сказа з рознымі відамі сувязі частак), 43 % тых абітурыентаў, што выконвалі 8-ы варыянт тэста, далі абсалютна правільны адказ. Разам з тым 14 % паступаючых, хто ўзяў за правільны адказ пункт 1, а таксама 10 % і 24 % іспытуемых, хто не ўключыў у правільны адказ пунктаў 2 і 5 адпаведна, не засвоілі правіл пастаноўкі коскі ў складаназалежных сказах; 36 % паступаючых, якія ў правільны адказ не ўключылі пункта 3, не ведалі правіл пастаноўкі двукроп’я ў бяззлучнікавых складаных сказах; 16 % тых паступаючых, хто адказаў, што паміж часткамі, звязанымі пры дапамозе супраціўнага злучніка *а*, коска не ставіцца, не засвоілі правіл пастаноўкі знакаў прыпынку ў складаназлучаных сказах.

Добрае веданне спосабаў афармлення простай мовы (заданне А28) у бягучым годзе прадэманстравала 68 % паступаючых (падчас ЦТ-2018 — 60 %). Нягледзячы на даволі высокі працэнт тых, хто справіўся з заданнем, узровень яго складанасці (32 % іспытуемых дапусцілі памылкі) здаецца нетыповым, бо прапанаваная ў тэсце пунктуацыйная сітуацыя з’яўляецца запатрабаванай на працягу ўсяго курса навучання ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі. Разгледзім яе на прыкладзе з 9-га варыянта экзаменацыйнай работы.

Узор задання:

А28. Адзначце знакі прыпынку (знак прыпынку), якія (які) трэба паставіць на месцы пропуску ў сказе:

«Зірні, які дзіўны сняжок пасыпаў, — звярнулася да мяне мама__ Чысцюткі, нібы яго недзе там, на небе, памылі, зіхоткі і такі сухі, што, здаецца, звініць».

1) коску і працяжнік;
2) коску;
3) кропку і працяжнік;
4) двукроп’е;
5) двукроп’е і працяжнік.

Адказ: 3.

Для выканання задання, як бачым, ёсць усе даныя: месца простай мовы ў дачыненні да слоў аўтара вызначаць не трэба; месца пастаноўкі знака прыпынку канкрэтызавана пропускам; пра тое, што словы аўтара падзяляюць простую мову на дзве самастойныя часткі (два апавядальныя сказы), паведамляе напісанае з вялікай літары слова *Чысцюткі*; знакі прыпынку, якія ставяцца ў сказе з простай мовай, названы. Справіліся з заданнем, пададзеным у 9-м варыянце, які выконвалі 2114 чалавек, 64 % іспытуемых. Дапушчаныя некаторымі абітурыентамі памылкі можна растлумачыць простай няўважлівасцю. Аднак у цэлым пытанне застаецца адкрытым. Тым больш што ўжо не раз намі было заўважана: абітурыенты дапускаюць памылкі, па нейкай прычыне ўскладніўшы заданні, якія не патрабуюць сур’ёзных мысліцельных аперацый, для выканання якіх дастаткова аўтаматызаванай дзейнасці.

Маўленне. Тэкст. Стылістыка.

Перад тым як назваць асноўныя вынікі выканання заданняў на праверку ўменняў аналізаваць сэнсавую структуру тэкстаў розных стыляў (заданне А29), адкрыем спіс тэарэтычных ведаў і практычных уменняў, якімі павінны былі валодаць навучэнцы, каб паспяхова іх выканаць: 1) беларуская літаратурная мова развіваецца ў вуснай і пісьмовай разнавіднасцях, у адпаведнасці з чым вуснай мове належыць гутарковы стыль, а пісьмовай — кніжныя стылі: мастацкі, навуковы, публіцыстычны і афіцыйны; 2) у некаторых стылях шырока выкарыстоўваюцца моўныя сродкі іншых стыляў маўлення, аднак тэкст кожнага стылю валодае прыкметамі, якія характэрны ў большай ступені яму, а не іншаму.

Безумоўна, гэты спіс не закрыты, але яго дакладнае веданне можа дапамагчы не памыліцца правільна вызначыць, напрыклад, мастацкі стыль, не зблытаўшы яго з гутарковым ці публіцыстычным, без праблем устанавіць тэкст публіцыстычнага стылю, не зблытаўшы яго з мастацкім. Дарэчы, у бягучым годзе паступаючыя па-ранейшаму больш за ўсё памылак дапусцілі ў вызначэнні стылёвай прыналежнасці публіцыстычных тэкстаў.

Уменне аналізаваць сэнсавую структуру тэксту, пазнаваць новыя словы, бачыць унікальнасць кожнага з іх — гэта, бясспрэчна, вельмі ўдзячная справа. Вызначыць слова, якога не стае ў кантэксце, прапаноўвалася ўдзельнікам тэсціравання ў заданні А30, прааналізаваць і адрэдагаваць моўны матэрыял, узяты з розных сфер сучаснай камунікацыі, — у заданні В7.

Разгледзім прыклад задання А30 з 7-га варыянта тэста (варыянт выконвалі 2093 чалавекі) і колькасць адказаў паступаючых у працэнтных адносінах насупраць кожнай опцыі.

Узор задання:

А30. Адзначце слова, якое павінна стаяць на месцы пропуску ў ***2-м*** сказе тэксту:

1) натхніла (77,02);
2) узгадавала (7,69);
3) нарадзіла (6,83);
4) адкрыла (4,73);
5) прывяло (11,23).

(1) *Якое ж яно прыгожае — возера-легенда Свіцязь!* (2) *Як многа таленавітых людзей ... яно на творчасць!* (3) *І ў першую чаргу — нашага славутага земляка, генія сусветнай літаратуры Адама Міцкевіча.*

Адказ: 1.

Як бачым з прыкладу, абсалютная большасць іспытуемых, знайшоўшы ў сваім інтэлектуальным “архіве” слова *натхніла*, правільна ўжыла яго ў кантэксце — у адпаведнасці з лексічным значэннем *(выклікала душэўны ўздым, заахвоціла да творчасці)* дадзенай моўнай адзінкі.

Прычыны памылак абітурыентаў, якія адказалі, што можна *ўзгадаваць, нарадзіць, адкрыць, прывесці на творчасць,* — небагаты слоўнікавы запас, няўважлівасць да семантыкі слоў, адсутнасць ведаў пра граматычныя нормы беларускай літаратурнай мовы.

Прыклад задання В7 возьмем з 5-га варыянта тэста.

Узор задання:

В7. Знайдзіце ў прапанаваным сказе немэтазгодна (збыткоўна) выкарыстанае слова, якое парушае правільнасць маўлення. Запішыце гэта слова ў той граматычнай форме, у якой яно пададзена ў сказе:

У музеі Якуба Коласа захоўваюцца рукапісы і машынапісныя тэксты твораў, прыжыццёвыя выданні кніг, перапіска з беларускімі і рускімі літаратарамі, уласнаручныя аўтографы і фотаздымкі пісьменніка.

Адказ: уласнаручныя.

Усяго з прыведзеным заданнем працавалі 2110 чалавек. Ведалі і лексічнае значэнне слова *аўтограф (уласнаручны подпіс)*, і законы парушэння лексічнай спалучальнасці 40 % іспытуемых. Яны правільна ідэнтыфікавалі слова *ўласнаручныя* як збыткоўнае (плеаназм).

Найбольш папулярнымі сярод памылковых адказаў былі: *машынапісныя* (244 чалавекі), *прыжыццёвыя* (208 чалавек), *перапіска* (183 чалавекі). Такім чынам, больш за 400 чалавек назвалі немэтазгоднымі словы, якія нясуць важную ўдакладняльную інфармацыю: *не рукапісныя тэксты, а машынапісныя; не пасляжыццёвыя выданні, а прыжыццёвыя.* А 183 абітурыенты, палічыўшы непатрэбным слова *перапіска*, нават не заўважылі, як без яго распадаецца ўсё выказванне. Параўнаем: *У музеі Якуба Коласа захоўваюцца рукапісы і машынапісныя тэксты твораў, прыжыццёвыя выданні кніг, з беларускімі і рускімі літаратарамі, уласнаручныя аўтографы і фотаздымкі пісьменніка.*

Шаноўныя абітурыенты 2020 года! У артыкуле мы падалі звесткі аб выкананні тэста-2019 па беларускай мове і ў лаканічнай форме акумулявалі тыповыя памылкі. Напрыканцы нагадаем вам некаторыя метадычныя рэкамендацыі, падрыхтаваныя на аснове аналізу вынікаў ЦТ.

Вельмі важна засвоіць вучэбную праграму ў поўным аб’ёме, а не рыхтавацца толькі да выканання тэставых заданняў пэўных тыпаў, з пэўным паэлементным зместам. Экзаменацыйны бал залежыць ад узроўню тэарэтычных (лінгвістычных) ведаў і практычных навыкаў, а не ад формы падачы моўнага матэрыялу ў тэставым заданні.

Ігнараванне літаратурных нормаў недапушчальна не толькі ў пісьмовым, але і ў вусным маўленні. Адзін з класічных шляхоў да поспеху на экзамене па роднай мове — уважлівае стаўленне да беларускага слова.

Паважаныя абітурыенты! Дадзены матэрыял інфармацыйна-даведачны. А для таго каб вы змаглі праверыць свае веды па мовазнаўчых раздзелах, удакладніць недастаткова засвоеныя тэмы, узнавіць забытае і папярэдзіць забыванне, РІКВ прапануе вам наступныя матэрыялы: зборнік тэстаў ЦТ-2019, зборнік тэстаў ЦТ-2018, поўны зборнік тэстаў, які ўключае заданні ЦТ 2014—2017 гг.

Ацаніць узровень сваіх ведаў па прадмеце і вызначыць рэзультатыўныя шляхі далейшай падрыхтоўкі вы зможаце, прыняўшы ўдзел у рэпетыцыйным тэсціраванні.

РІКВ жадае поспеху ўсім абітурыентам 2020 года!

Матэрыял прапанаваны Рэспубліканскім інстытутам кантролю ведаў.
Фота Алега ІГНАТОВІЧА.

Жыццёвыя ўрокі ў Купалаўскім

Каб дзеці ведалі і любілі беларускую мову, ім трэба, прынамсі, яе чуць.

Чуць, як хораша па-беларуску гучыць айчынная, руская, англійская класіка — Купала, Мележ, Дунін-Марцінкевіч, Чэхаў, Шэкспір... Як па-іншаму, ярчэй і смялей, успрымаюцца на нашай мове фантазіі Гогаля. Як ментальна блізкія кожнаму з нас героі горватаўскага “Радзіва Прудок”. Застаецца толькі ўздыхнуць ад захаплення, убіраючы ў сябе ўсё гэта хараство, і выдыхнуць ужо з фінальнымі апладысментамі.

100-ы сезон у Купалаўскім тэатры! Аншлагі з самага першага дня. Кожны спектакль — падзея!

Для беларускіх настаўнікаў рэпертуар Купалаўскага — сапраўдны скарб. Тут ставяць многа праграмных твораў (“Людзі на балоце” Мележа, “Паўлінка” Купалы, “Вечар” Дударава, “Пінская шляхта” Дуніна-Марцінкевіча і інш.), у пастаноўках задзейнічаны лепшыя артысты-“купалаўцы”. Таму, калі ёсць мэта не толькі навучыць, не толькі выхаваць, але і дапамагчы адчуць, спасцігнуць, палюбіць, трэба абавязкова прыйсці сюды. Тут, у Купалаўскім тэатры, можна даць сапраўды важныя жыццёвыя ўрокі.

100-ы сезон у Купалаўскім тэатры асаблівы. Артысты адкрылі яго на пачатку верасня, запрасіўшы гледачоў на вялікі гарадскі пікнік, і цяпер, на парозе другога веку, прапаноўваюць як любімую класіку, так і новы фармат узаемаадносін: шмат інтэрактыву, непасрэдных зносін, сумеснай творчасці. Тэатр сталее і адначасова маладзее — у гэтым, напэўна, і заключаецца адна з тайн яго неверагоднай папулярнасці ў мінчан і гасцей горада.

Наведайце Купалаўскі тэатр у яго 100-ы сезон — сапраўды, гэта тое, што потым можна расказваць дзецям і ўнукам. Асабліва важна, каб сюды прыходзіла моладзь. Для кагосьці такі візіт стане вельмі яркім і важным адкрыццём — мастацтва, мовы, жыцця, сябе...

Галіна СІДАРОВІЧ.
sidarovich@nastgaz.by
Фота Алега ІГНАТОВІЧА.

Паважаныя чытачы! Задаць свае пытанні і выказаць прапановы па матэрыялах дадатку вы можаце на e-mail: sidarovich@nastgaz.by .